окончания коренных преобразований губернатор советовал правительству дать местному начальству в распоряжение дополнительные отряды легкой конницы и пехоты [1, с. 180]. М.Н. Муравьев настойчиво требовал обратить главное внимание на замену «туземцев» русскими чиновниками. По его мнению «туземцам... полезно было бы доставить возможность служить внутри России» [1, с. 177]. Могилевский губернатор соглашался только на то, чтобы местные чиновники служили лишь в гражданских палатах. Уголовные же палаты, городские правления, главные полицейские управы, судебные присутственные места, служащие канцелярий в губерниях и уездах, наконец, чиновники почтового ведомства должны быть из коренных русских, непосредственно подчинявшихся губернатору.

Важно, что в записке 1831 г. предлагалось учредить особый Комитет «для единообразного сосредоточения всех распоряжений, касательно предстоящий коренных преобразований в сих областях» [1, с. 176-177], то есть М.Н. Муравьев этим «предсказал» образование Комитета западных губерний – своеобразного территориального министерства по управлению западными губерниями, действовавшего с 1831 по 1848 гг. и являвшегося «мозговым» центром», формировавшим общую стратегию и тактику правительства на западной окраине [2, л. 5].

## Литература

1. Муравьев, М.Н. Четыре политические записки о Северо-Западном крае. 1830 г., 1831 г., 1864 г., 1865 г./ М.Н. Муравьев // Русский архив. — 1885. — № 6. — С. 161-199.

2. Российский государственный исторический архив в Санкт-Петербурге. – Фонд 1266. – Оп. 1. - Д. 8. Журнал Комитета западных губерний за 1831 г.

УДК 629.73

# РОЛЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У ВЫТВОРЧЫМ ПРАЦЭСЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА АЭРАПОРТА «МІНСК»

Шчаўлінскі М. Б. к.г.н., дацэнт
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Будаўніцтва галоўных "паветраных варот" Рэспублікі Беларусь-Нацыянальнага аэрапорта "Мінск" – пачалося ў 1980 гг. За гэты час авіяпрадпрыемства прайшло вялікі і складаны шлях – ад будаўніцтва

першых аэрапортавых аб'ектаў да збудавання сучаснага авіяцыйнага комплексу.

Сёння “Нацыянальны аэрапорт Мінск” па сваіх тэхналагічных характарыстыках і аснашчэнні не мае сабе роўных у Беларусі. Больш за тое, ён лічыцца адным з лепшых аэрапортаў СНД. Аэравакзальны комплекс абсталяваны сучасным імпартным абсталяваннем перадавых фірмаў Германіі, Францыі, Швецыі і з'яўляецца ўнікальным архітэктурным збудаваннем з прапускной здольнасцю 5,8 млн авіяпасажыраў у год і апрацоўкай 300 т.грузу ў суткі. .

У цяперашні час рэгістрацыя авіяпасажыраў ажыццяўляецца ў шасці назапашвальніках. Дзякуючы значным плошчам аэравакзала – 75 тыс.м$^2$ – у ім шырока развіта сетка паслуг для авіяпасажыраў, што адпавядае патрабаванням міжнароднай транспартнай асацыяцыі (IATA). Да ліку паслуг адносяцца:

- залы для абслугоўвання пасажыраў бізнес-класа;
- консульскі пункт Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, дзе пасажыры, якія прыбылі, могуць атрымаць дазвол на часовае знаходжанне ў Рэспубліцы Беларусь;
- страхавыя кампаніі, якія ажыццяўляюць медыцынскае страхаванне грамадзян
- сістэма мытнага кантролю пасажыраў па прынцыпе “зялёнага” і “чырвонага” калідораў;
- сістэмы тэлефоннай і факсімільнай сувязі;
- урадавы сектар і зала для абслугоўвання VIP-пасажыраў і дэлегацый;
- комплексная сістэма інфармавання пасажыраў і многія іншыя [1, с.19-20].

У апошнія гады на прадпрыемстве вядзецца актыўная праца па павышэнні задаволенасці спажыўцоў, у сувязі з чым асвойваюцца новыя віды дзейнасці, пашыраецца спектр паслуг пасажырам. Многім поспехам калектыў авіяпрадпрыемства абавязаны рабоце, якая пастаянна праводзіцца ў сферы ўкаранення новых інфармацыйных тэхналогій ва ўсіх структурных падраздзяленнях Нацыянальнага аэрапорта “Мінск”. Асаблівая роля ў выкарыстанні авіяпрадпрыемствам глабальных аўтаматызаваных сістэм і сродкаў авіяцыйнай сувязі належыць Службе інфармацыйных тэхналогій, якая была створана ў маі 2012 г. на аснове аддзела інфармацыйных тэхналогій. Узначальвае службу Пратасавіцкі Андрэй Міхайлавіч.

Асноўнымі задачамі службы інфармацыйных тэхналогій, як і аддзела, з'яўляюцца развіццё і ўкараненне новых інфармацыйных тэхналогій, сістэмных праграмных сродкаў і спадарожнага праграмнага забеспячэння,

арганізацыя абмену інфармацыяй, забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі і г. д.

Акрамя таго, спецыялісты ў галіне ІТ-тэхналогій аказваюць інфармацыйную і тэхнічную падтрымку іншым падраздзяленням аэрапорта ў частцы эксплуатацыі і суправаджэння аўтаматызаваных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі аэрапорта «Кобра», праграмнага комплексу бухгалтарскага ўліку «Галактыка», займаюцца развіццём і мадэрнізацыяй лакальнай вылічальнай сеткі прадпрыемства, аўтаматызаванай інфармацыйна-пошукавай сістэмы авіяцыйнай бяспекі.

У чэрвені 2008 г. ў Нацыянальным аэрапорце "Мінск" была ўкаранёна сістэма агульнага доступу Sita CUTE (Common use terminal equipment) [1, с.21]. Сістэма забяспечвае адзіную праграмна-апаратную платформу для паралельнай працы розных сістэм кіравання адпраўкамі (рэгістрацыі пасажыраў) у буйных аэрапортах, падтрымлівае і кіруе працэсамі як стандартнай, так і самастойнай рэгістрацыі пасажыраў. У мэтах аптымізацыі сістэмы рэгістрацыі на рэйсы ў кампаніі SITA набыты 4 кіёска самарэгістрацыі, што дазваляе прадастаўляць авіякампаніям і пасажырам хуткі і эфектыўны спосаб рэгістрацыі на рэйс.

Выкарыстанне падобнай платформы дазволіла аэрапорце выйсці на ўзровень міжнародных стандартаў у абслугоўванні авіякампаній, дапамагло палепшыць якасць абслугоўвання кліентаў аэрапорта.

У 2011 г. для зручнасці пасажыраў у будынку аэравакзальнага комплексу размешчаны аплатныя тэрміналы «Крэдитекс Пэйнет», якія прадастаўляюць магчымасць ажыццяўлення электронных плацяжоў з дапамогай банкаўскай карткі і наяўных сродкаў.

Вялікае значэнне ў якасным прадастаўленні пасажырам паслуг мае стварэнне ў маі 2012 г у Нацыянальным аэрапорце «Мінск» прэс-цэнтра. Прафесійныя журналісты і PR-менеджэры, дызайнеры і рэкламісты, якія прыйшлі яшчэ на стадыі фарміравання падраздзялення, бачылі сваю асноўную задачу ў стварэнні і падтрымцы яркага індывідуальнага вобраза авіяпрадпрыемства. Для вырашэння пастаўленых задач супрацоўнікі прэс-цэнтра з першых дзён сваёй дзейнасці асаблівую ўвагу надалі працы з беларускімі і замежнымі СМІ, арганізацыі PR-акцый і прэс-канферэнцый, рэканструкцыі дзеючага афіцыйнага сайта, распрацоўцы перспектыўных інфармацыйных праектаў і прыцягненню новых партнёраў, а таксама змене падыходаў да размяшчэння рэкламы ў сценах самога аэрапорта.

У цэлым імкненне калектыву авіяпрадпрыемства адпавядаць сусветным стандартам якасці прадастаўлення паслуг пацвярджаецца наяўнасцю ў "Нацыянальнага аэрапорта" Мінск" чатырох сертыфікаваных сістэм менеджменту.

За апошнія гады статус паспяховага прадпрыемства РУП “Нацыянальны аэрапорт Мінск” заслужыў апраўдана, што і было адзначана ў 2009 годзе прэміяй урада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці, а таксама прэміяй конкурсу Міністэрства транспарту і камунікацый у 2011 г.

І сёння па-ранейшаму ў планах развіцця Нацыянальнага аэрапорта “Мінск” на бліжэйшую будучыню прыярытэтнымі задачамі з'яўляюцца пастаянная актывізацыя работы па павышэнні задаволенасці спажыўцоў, у сувязі з чым на авіяпрадпрыемстве штогод асвойваюцца новыя віды дзейнасці, пашыраецца спектр прадастаўляемых паслуг пасажырам. У гэтай сувязі авіяпрадпрыемства заключыла шэраг дагавораў з ААТ “ААБ Беларусбанк”, на аснове якіх будзе ажыццяўляцца фінансаванне рэканструкцыі дзеючага аэравакзальнага комплексу “Нацыянальнага аэрапорта” Мінск” [2, с.18].

## Літаратура

1. Щавлинский Н. Б. Национальный аэропорт Минск: 30 лет с вами / Н. Б. Щавлинский. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2013. – 80 с.

2. Корнев В. И. На пересечении воздушных трасс: Национальному аэропорту Минск исполняется 30 лет / В. И. Корнев // Вестник. Информационный бюллетень ОАО “АСБ Беларусбанк”. 2013. - №3.